УДК 911.373

Вайтовіч С. А.

# ЧАРОЎНЫ І ТАЯМНІЧЫ СВЕТ БЕЛАРУСКАГА ТКАНАГА І ВЫШЫВАНАГА АРНАМЕНТУ

*Навуковы кіраўнік: Міцкевіч К. М., ст. выкладчык*
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**

Развіццё беларускага тканага і вышыванага арнаменту ніколі не спынялася. Старажытны арнамент характарызаваўся сваёй геаметрычнасцю, потым дадаваліся стылізаваныя раслінныя матывы. Да да больш пазнейшага арнаменту далучыліся як моцна стылізаваныя, так і досыць рэалістычныя зааморфныя і арнітаморфныя ўзоры. Старажытны беларускі арнамент з’яўляўся вельмі сімвалічным, што нельга сказаць пра арнаментальныя сімвалы пачатку XX стагодзя, якія былі больш дэкаратыўнымі.

**Ключавыя словы**: беларускі арнамент, сімвалічнасць, арнамент ручнікоў, арнамент народных касцюмаў

Voytovich S. A.

# THE MAGICAL AND MYSTERIOUS WORLD OF BELARUSIAN WOVEN AND EMBROIDERED ORNAMENTS

*Scientific Supervisor: Mitskevich K. M., Senior Lecturer*
*Belarusian National Technical University*
*Minsk, Republic of Belarus*

**Abstract**

The development of Belarusian woven and embroidered ornaments has never stopped. The ancient ornament was characterized by its geometricity, then stylized plant motifs were added. The later ornament was joined by strongly stylized and quite realistic zoomorphic and ornithomorphic patterns. The ancient Belarusian ornament was very symbolic, which

cannot be said about the ornamental symbols of the early 20th century, which were more decorative.

**Keywords**: Belarusian ornament, symbols, ornament of towels, ornament of belarusian costumes

## 1. Зараджэнне і развіццё беларускага арнаменту. Вытокі беларускага народнага арнаменту: ад графемы да сімвала

Каб зразумець глыбінны сэнс, каб спасцігнуць усю арнаментальную таямнічасць арнаменту беларускай культуры і выявіць, калі пачалося зараджэнне асноў беларускага народнага арнаменту, былі прааналізаваны энцыклапедычныя выданні.

На Беларусі найбольш раннія формы арнаменту знойдзены на рэчах эпохі верхняга палеаліту (ад 40 да 10 тысяч гадоў таму назад). Гэта былі вырабы з косці і рога. У мезаліце (10 – 6 тыс. гадоў да н.э.) ён значна пашырыўся. А ў перыяд неаліту (6 – 3 тыс. гадоў да н. э.) атрымаў сваё развіццё, дасягнуў большай разнастайнасці ў мастацтве (на керамічным посудзе, касцяных вырабах). У жалезным веку (1200 г. да н.э. – 340 г. н.э.) арнаментаваліся таксама і металічныя вырабы.

Акрамя мовы чалавек выказваў сваё разуменне навакольнага свету наглядна, пры дапамозе знакаў і сімвалаў, адлюстроўваючы асобныя паняцці і ўяўленні. Нашы далёкія продкі пачалі чаргаваць розныя знакі і такім чынам складаць арнаменты.

Так на камянях, касцяных пласцінках, на скуры з'явіліся першыя найпрасцейшыя выяўленчыя элементы-графемы: плямы, лініі, рыскі, кропкі, насяканні, якія неслі нейкую зашыфраваную інфармацыю. Але ўсё гэта было пазбаўлена напаўнення глыбокім сімвалічным сэнсам.

Ускладняючы прасцейшыя графемы старажытнасці – круг, квадрат, ромб, крыж, трохвугольнік, зігзаг, хвалю і іншыя, чалавек стварыў знакі, якія мелі нескладаны змест. Неўзабаве з'явіліся першыя сімвалы – знакі, напоўненыя глыбокім сэнсам, часцяком шматпланавым, супярэчлівым, зразумелым у кожным канкрэтным выпадку. Найбольш старажытныя помнікі з рунічнымі знакамі, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі, сустракаюцца сярод археалагічных прадметаў мезаліту. У калекцыі музея старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі захоўваецца

фрагмент косткі з выявай чалавека з узнятымі да неба рукамі (стаянка Азярцо, Цэнтральная Беларусь). Унізе выразаны знак, падобны руну Атылія. А што датычыцца семантычнага напаўнення рун у арнаменце, то яно застаецца дыскусійным.

## 2. Развіццё і станаўленне адметных рыс і характарыстык беларускага тканага і вышыванага арнаменту

Беларускі арнамент развіваўся ў рэчышчы культуры Старажытнай Русі ва ўзаемасувязі з рускім, украінскім, літоўскім, польскім арнаментальным мастацтвам і набыў свае спецыфічныя рысы, як і было сказана раней, у XIV-XVI ст. Найбольш гэтая спецыфіка выразна праяўляецца ў народнай вышыўцы, ткацтве, разьбе па дрэве, кераміцы. Але ў адрозненне ад суседніх этнасаў – рускіх і ўкраінцаў, беларусам не ўласцівы сюжэтна-выяўленчыя кампазіцыі [2].

Характэрнай асаблівасцю было дамінаванне ромба і яго шматлікіх па канфігурацыі варыянтаў, вакол якіх звычайна кампанаваліся іншыя элементы.

На Беларусі геаметрычны арнамент з ромбаў адзначаецца менавіта ў тых рэгіёнах, дзе земляробства з часоў старажытнасці было асноўным заняткам чалавека, менавіта там, дзе адкрыты найбольш старажытныя на тэрыторыі Беларусі археалагічныя помнікі земляробчых культур (Падняпроўе, Усходняе Палессе).

Існаваў традыцыйны набор сімвалаў і колераў, якія выкарыстоўвалі нашы продкі шмат стагоддзяў назад з дахрысціянскіх часоў. Беларусы, а калісьці і ўсе славяне, выкарыстоўвалі два колеры – чырвоны колер на белым фоне. Гэтыя колеры маюць глыбокую сімволіку. Белы фон – колер чысціні. Чырвоны – колер сонца, крыві як знака жыцця і, наогул, сімвал жыцця.

У беларусаў захоўвалася да XX стагоддзя чысціня ўзораў. Нашы карані – чырвоны ўзор на белым фоне. З канца XIX стагоддзя дадаўся чорны колер. Але ён ніколі не пераважаў, толькі адцяняў чырвоны. А сіні колер сустракаецца на народных арнаментах Паазер’я і Панямоння, і зразумела чаму [5].

Адметнай рысай у беларускай народнай арнаментыцы з'яўляецца адсутнасць вобразаў зла (д’ябла ці сатаны, чарцей). Хоць тэма барацьбы дабра і зла вельмі пашырана сярод славян. У беларусаў

услаўляюцца толькі станоўчыя якасці – дабро, любоў, прыгажосць, якія руплівыя ткачыхі адлюстроўваюць у сваіх палотнах. Узвышэннем гэтых якасцей спадзяваліся перамагчы, выкараніць з жыцця зло. Тканы матыў дабра – гэта адзін з найстаражытных матываў.

Другая адметная рыса заключаецца ў тым, што асобныя элементы арнаменту паўтараюцца 5 разоў, абавязкова гэта павінна быць 5 розных сілуэтаў, якія вышываюцца або ткуцца 5 радамі.

Развіццё беларускага тканага і вышыванага арнаменту ніколі не спынялася. Старажытны арнамент характарызаваўся сваёй геаметрычнасцю, потым дадаваліся стылізаваныя раслінныя матывы, да больш пазнейшага арнаменту далучыліся як моцна стылізаваныя, так і досыць рэалістычныя зааморфныя і арнітаморфныя ўзоры. У пач. XX ст. у арнаментальным мастацтве прысутнічалі нават савецкія лозунгі і заклікі.

Старажытны беларускі арнамент з’яўляўся вельмі сімвалічным, што нельга сказаць пра арнаментальныя сімвалы пач. XX ст., якія былі больш дэкаратыўнымі. У адрозненне ад старажытнага арнаменту, арнамент XIX - XX ст. больш рэалістычны, у ім можна вылучыць той ці іншы сімвал і растлумачыць яго сэнс.

## 3. Сімвалічнасць тканага і вышыванага арнаменту ручнікоў і народных касцюмаў Заходняга Палесся к. XIX – пач. XX стагоддзяў

З сімвалічнасцю тканага і вышыванага арнаменту ручнікоў і народных касцюмаў Заходняга Палесся можна азнаёміцца ў краязнаўчым музеі Беларускага Палесся, дзе на прыкладзе арнаменту, які аздабляе рушнікі і простую сялянскую вопратку пінчукоў к. XIX – пач. XX ст., можна выявіць тыя адметныя рысы, якія характэрны для арнаменту Заходняга Палесся як аднаго з гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў. Экспазіцыя рушнікоў у музеі досыць багатая і непаўторная, на экспазіцыі пераважаюць паласатыя ручнікі.

І гэта невыпадкова. Гэта звязана з тым, што ў Заходнім Палессі, дзе земляробства заўсёды было толькі дадатковы заняткам да рыбалоўства, палявання, жывёлагадоўлі, на традыцыйных тканінах замест ромба-геаметрычных выяў пануюць толькі першаўзоры – рытмічныя паўторы простых чырвоных палосаў, шлякоў.

Папярочныя чырвоныя палосы рознай шырыні рытмічна запаўняюць усю палатніну ручніка ці канцэнтруюцца па канцах. Гэта найстаражытнейшыя спосабы магічна-рытуальнай маркіроўкі тканіны, звязаныя з верай у засцерагальныя ўласцівасці чырвонай паласы. Такія ручнікі адносяцца да абрадавых найбольш архаічнага тыпу. Гэтыя палосы сімвалізуюць неабсяжнасць краявідаў, бязмежную раўніннасць.

Палеская жанчына – спрадвеку ткачыха. Седзячы за кроснамі, яна пакідала на ручніковым палатне чырвоныя адзнакі пройдзенага ёю шляху. Невыпадкова, што заходнепалескія паласатыя ручнікі па сваёй мастацкай прыродзе родныя палескім спевам, у якіх працяглаcць, манатоннасць гукаў таксама народжана палескім краявідам [4].

У паласатасці заходнепалескіх ручнікоў бачыцца прадэкор, найархаічны арнамент. Рыса, паласа, шляк – першааснова арнаментыкі. Гэта самы просты сродак абмежавання і ўпарадкавання прасторы, якую чалавек адваёўвае ў прыроды. Гэта паласатасць у традыцыйнай культуры Палесся захоўвалася і ў XX ст. як асноўны сродак мастацкай выразнасці. Можна зрабіць вывад, што развіццё тканага арнаменту на Палессі нібы спыніла свой рух на тысячагоддзі. Гэта тлумачыцца ізаляванасцю палескіх вёсак, якія знаходзіліся сярод лясоў і балот так і асобай ментальнасцю палешука, яго светапоглядам, успрыманнем прасторы. Такія ручнікі распаўсюджаны ў вёсках басейна ракі Прыпяць і яе прытокаў – Піны, Гарыні і Ясельды. У сваім найбольш чыстым варыянце чырвона-паласатыя ручнікі сустракаюцца ў Пінскім Палессі, якое характарызуецца найбольшай захаванасцю архаічных рыс.

Гэты лінейны арнамент несемантычны, не нясе сімвалічнага сэнсу. Яго магічнае ўздзеянне заключаецца не ў самой выяве, яе форме, якія ў сілу сваёй спрошчанасці, неразбудаванай першабытнасці не могуць быць знакам. Шлякі на заходнепаласатых ручніках уздзейнічаюць выключна магіяй чырвонага колеру і яго рытмічнай арганізацыяй. Чырвоны колер, узмоцнены рытмам паўтораў палос, пульсуе на ручніках нібы кроў у артэрыях. На рушніках сустракаеццастаксама сімвал зоркі – сімвал чалавека, што падкрэслівае яго веліч і прыгажосць. Тут яна аблямавана яшчэ і тыпічнымі для гэтага ўзору геаметрычнымі сімваламі.

У Музеі Беларускага Палесся таксама можна пабачыць і касцюмы простага селяніна і сялянкі 30-х гадоў XX ст. Гэта мужчыскі і жаночыя касцюмы, якія належаць да Пінска-Івацэвіцкага строю і адзін да Кобрынскага [6]. Заходнепалескі народны касцюм мае шмат варыянтаў, як і шматварыянтныя палескія дыялекты. Але галоўная адметная рыса гэтага касцюму – гэта яго незвычайная прастата. Ён у асноўным дэкараваўся тканымі ці вышыванымі палосамі.

Кашуля мужчынскага касцюму дэкаравана даволі рэалістычнымі раслiннымі матывамі, якія нагадваюць цвяткі васілька і рамонка. Яны сімвалізуюць поле, сенажаць. На мужчынскіх кашулях заўсёды густа вышывалі вобласць грудзі, дзе сонечнае спляценне. Лічылася, што тут знаходзіцца душа чалавека [7]. Паясы звычайна аздоблены традыцыйнымі для Заходняга Палесся палосамі. Прычым адна з іх сіняя, якая сімвалізуе ваду.

### 4. Сімвалічнасць вышыванага арнаменту на прыкладзе творчых калектываў горада Пінска

Каб выявіць асаблівасці сімвалічнасці сімвалічнасці і адпаведнасці традыцыям мінулага вышыванага арнаменту Пінска былі прааналізаваны сцэнічныя касцюмы творчых калектываў г. Пінска “Пінская шляхта”, “Гарэзлівыя шляхцюкі”, Дзіцячай харэаграфічнай школы.

З усіх касцюмаў калектыва “Пінская шляхта” аўтэнтычным з’явіўся толькі адзін. Ён зроблены па ўсім канонам беларускага арнаменту. Стылізаваную Зорку і сімвал Вадзяніка можна разгледзець няўзброеным вокам. Зорка – сімвал чалавека, Вадзянік – гаспадар балот. Гэтым узорам аздоблены як мужчынскія, так і жаночыя касцюмы.

У першым варыянце касцюма калектыва “Гарэзлівыя шляхцюкі” (можна адзначыць, што гэта “малодшы брат” калектыва “ Пінская шляхта”) зроблены акцэнт на блакітны і сіні колер. Колер васілька і азёраў. На паясах хлопцаў прысутнічае пэўны рамбічны арнамент. Нават магчыма разгледзець у ім сімвал Зямлі. Але арнамент паясоў хутчэй дэкаратыўны,чым сімвалічны, як і касцюм у цэлым.

## Заключэнне

Мэтай даследвання было прасачыць зараджэнне і шматвекавое развіццё сімвалічнага сэнсу беларускага тканага і вышыванага арнаменту. Каб гэта зрабіць прыйшлося дасканала разгледзець станаўленне адметных рыс беларускай арнаментыкі, якое пачалося яшчэ ў далёкім мінулым. На прыкладзе ручнікоў, народных і сцэнічных касцюмаў Заходняга Палесся было вызначана, што для многіх людзей на першы позірк з'яўляецца толькі ўпрыгожваннем. А на самой справе кожны ромбік, кожная кветачка напоўнены складаным, глыбінным сэнсам, які яшчэ прыйдзецца расшыфроўваць не аднаму пакаленню нашчадкаў Беларусі. Беларускі арнамент XXI стагоддзя выконвае не толькі дэкаратыўную функцыю, але ён з'яўляецца глыбока сімвалічным, дакладным. Ён ўвабраў у сябе традыцыі, якія зарадзіліся яшчэ ў XIV-XVI стагоддзях.

Неабходна працягваць даследванне беларускіх арнаментальных матываў, бо яшчэ не ўсе матывы вызначаны. Пакуль існуе цяга да сваіх традыцый, імкненне да захоўвання іх, існуе нацыя.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Агеева, Л. Е. Народный орнамент как исторический феномен (рунические знаки в белорусском традиционном ткачестве) / Л. Е. Агеева // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: Материалы междунар. науч. конф. БГУ. Минск, 15–16 апр. 2004 г. / редкол.: В. Н. Сидорцов. (отв. ред.) и др. – Мн: БГУ, 2004. – С. 104 – 105.

2. Віннікава, М. М. Скарбы з вясковых куфраў. Традыцыйны касцюм і тэкстыль з калекцыі "Народнае мастацтва Беларускага Палесся": ілюстраваны каталог / М. М. Віннікава, П. А. Богдан. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броукі, 2009. – 182 с.: іл.

3. Кацар, М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва і вышыўка / М. С. Кацар; пер. з рус. мовы, літ. апрац. і навук. рэд. Я. М. Сахуты. – 2-е выд. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2009. – 224 с.: іл.

4. Лабачэўская, В. А. Повязь часоў. Беларускі ручнік: альбом / В. А. Лабачэўская. – Мінск: Беларусь,2009. – 298с.: іл.

5. Лобачевская, О. А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О. А. Лобачевская, З. И. Зимина. – Минск: Беларуская навука, 2009. – 279 с.: іл.

6. Раманюк, М. Ф. Беларускі нацыянальны касцюм. Пінска-Івацэвіцкі строй: рэкламнае выданне на беларускай мове / М. Ф. Раманюк. – Мінск: Полымя, 1992.

7. Раманюк, М. Ф. Народныя касцюмы Піншчыны / М. Ф. Раманюк // Беларуская мова ў школе. – 1989. - №5. – с. 63–66.